# Марыя Раманаўна ЦІТАРЧУК



## 1985-2021

**8 лютага 2021 года пайшла з жыцця гродзенская паэтэса, празаік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Марыя Раманаўна Цітарчук. Прычынай смерці сталі наступствы перанесенага каронавірусу.**

Марыя Раманаўна Цітарчук нарадзілася 20 ліпеня 1985 года ў Гродне. Скончыла рамана-германскае аддзяленне Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы па спецыяльнасці «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурных камунікацый». У 2009 годзе скончыла магістратуру ГрДУ імя Янкі Купалы па спецыяльнасці «Літаратура народаў краін замежжа» (польская літаратура). Працавала малодшым навуковым супрацоўнікам у аддзеле рэдкай кнігі Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. Выдала зборнікі лірыкі: «Вераснёўскія мроі» (2008), «В лучах серебряного сна» (2010), а таксама кнігу прозы «Феи приходят в полночь» (2012). Творчасць пісьменніцы адрозніваецца непаўторнай атмасферай рамантызму, фантасмагорыі, гратэску. У ёй узвышанае цесна пераплятаецца з зямным, банальнае з цудоўным. Жыццёвая філасофія літаратурных герояў Марыі Цітарчук – гэта прыярытэт духу над матэрыяй, свабоды над умоўнасцямі. Свабода творчасці, палёт фантазіі, адукаванасць, высокая культура і тонкі мастацкі густ складалі стыль жыцця самой пісьменніцы, чалавека, усёй душой закаханага ў мастацтва. Марыі было ўласціва прагрэсіўнае мысленне, нетрывіяльны, часам нечаканы погляд на рэчаіснасць. Пра такіх людзей кажуць «не от мира сего». І сапраўды, маладая пісьменніца з горада над Нёманам жыла ў сваім уласным свеце – з яркіх мар, арыгінальных вобразаў, высокіх пачуццяў і вечных каштоўнасцяў, дзе панавалі гармонія, дабрыня і прыгажосць. Такой – заўсёды яркай, таленавітай і ні да каго не падобнай яна запомніцца сваім чытачам, сябрам і калегам. Светлая памяць пра гродзенскую пісьменніцу Марыю Раманаўну Цітарчук застанецца ў нашых сэрцах назаўсёды.

Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі